УДК 793.22:398.332(476.1)

**Г. А. Гурло,**
*загадчык раённага цэнтра традыцыйнай культуры*
*дзяржаўнай установы «Капыльскі раённы цэнтр культуры»,*
*г. Капыль, Рэспубліка Беларусь*

# ЗАХАВАННЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ КАЛЯДНАГА АБРАДУ «ЦАРЫ КАЛЯДЫ» в. СЕМЕЖАВА (з вопыту работы ўстаноў Капыльскага раёна)

**Анатацыя.** *Асвятляюцца пытанні аднаўлення, захавання і папулярызацыі элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Калядныя цары», гісторыя ўзнікнення, аналізуюцца рызыкі існавання абраду, меры па забеспячэнні аховы, ролі носьбітаў традыцый у захаванні і ўздзеянне культурнага турызму на працэсы адраджэння народнай спадчыны.*

**Ключавыя словы**: *гісторыя адраджэння, захаванне і папулярызацыя, культурны турызм, абрад, «Цары Каляды» («Калядныя цары»), Семежава*

**G. Gurlo,**
*Head of the district centre of traditional culture of the State Institution*
*«Kopyl district centre of culture» Kapyl, Belarus*

# PRESERVATION AND POPULARIZATION OF THE CHRISTMAS RITE «CHRISTMAS KINGS» IN THE VILLAGE OF SEMEZHAVA (from the experience of Kapyl district institutions)

**Abstract**. *The article analyses the issues of restoration, preservation and popularization of the element of intangible cultural heritage "Christmas Kings", the history of its origin, the risks of the existence of the rite, measures to ensure protection, the role of the bearers of traditions in preservation and the impact of cultural tourism on the processes of revival of national heritage.*

**Key words:** *revival history, preservation and popularization, cultural tourism, ritual, " Christmas Kings ", Semezhava.*

Нематэрыяльная культурная спадчына – тая з’ява, існаванне якой знаходзіцца пад пагрозай з-за глабалізацыі і акультурацыі, недасведчанасці грамадства, неразумення яе каштоўнасці і адсутнасці пераемнасці. І захаванне яе – гэта забеспячэнне жыццядзейнасці і ўстойлівага развіцця, дзеля чаго неабходна эфектыўная сістэма аховы з боку дзяржавы і грамадскіх інстытутаў.

Ідэя адраджэння народных каляндарных свят не новая, але надзвычай важная і заўсёды актуальная, бо гэта духоўная спадчына мінуўшчыны. Сакрэт жывучасці спадчыны ў тым, што, услаўляючы спрадвечныя святыні продкаў і пакланяючыся ім, чалавек мог адчуваць сябе вольным, а на свяце выступаць асобаю, якая прыродна выяўляла свой розум, кемлівасць, спрыт, знаходлівасць, таленавітасць, артыстычнасць і інш. Ведаць сваю нацыянальную народную творчасць, родную мову, гісторыю і культуру – гэта значыць не парываць з вытокамі, адкуль родам.

Менавіта гэтая задача вельмі паспяхова і з вялікай любоўю вырашаецца на Капыльшчыне, у вёсцы з прыгожай самабытнай назвай Семежава, якая стаіць на месцы зліцця дзвюх невялікіх рэчак Мажа і Морач. Асаблівай рысай жыхароў вёскі лічыцца працавітасць. Ва ўсе часы яны вылучаліся між суседзяў высокім дабрабытам. Другая адметная рыса семежаўцаў – асаблівая, трапяткая любоў да сваёй гісторыі, сваёй спадчыны. Не дзіўна, што менавіта тут, у Семежаве, быў адроджаны ўнікальны шчадравальны абрад «Калядныя цары», які сваімі каранямі сыходзіць у XVIII ст.

У 90-я гг. мінулага стагоддзя з мэтай адраджэння і развіцця народных промыслаў і рамёстваў, свят і абрадаў у раёне быў праведзены шэраг этнаграфічных экспедыцый супрацоўнікамі Капыльскага раённага метадычнага цэнтра. Па выніках экспедыцый ад жыхароў, відавочцаў в. Семежава былі сабраны пэўныя звесткі аб абрадзе, але для дасканалага даследавання ў 1996 г. у раён былі запрошаны навукоўцы з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З дапамогай кандыдата гістарычных навук Т. І. Кухаронак ад жыхара в. Семежава, былога ўдзельніка каляднага гурта 60-х гг., Мікалая Афанасьевіча Скамароха (1939 г. н.) быў запісаны і апрацаваны матэрыял, а на наступны год (1997) па напісаным сцэнарыі Белвідэацэнтрам быў зняты фільм. Унікальнасць абраду – у складзе ўдзельнікаў, касцюмах, дыялогах. А яшчэ ў тым, што праводзіцца ён толькі тут, у в. Семежава Капыльскага раёна. Нідзе больш у Беларусі гэты абрад не сустракаецца.

У 2007 г. абрад «Цары Каляды» («Калядныя цары») быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. А ў 2009 г. рашэннем IV сесіі Міжурадавага камітэта ЮНЕСКА ўключаны ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якой патрабуецца тэрміновая ахова. Гэта азначала, што абраду нададзены асаблівы ахоўны статус як сусветнай культурнай каштоўнасці. Абрад «Калядныя цары» – першы аб’ект нематэрыяльнай спадчыны ў нашай краіне, узяты пад ахову ЮНЕСКА.

Чаму менавіта гэты абрад зацікавіў міжнародную культурную супольнасць? Як адзначыла эксперт ад Беларусі ў Міжурадавым камітэце ЮНЕСКА Ала Сташкевіч, для таго, каб абрад трапіў у Спіс нематэрыяльнай духоўнай спадчыны, «патрэбна, каб ён быў жывым – ішоў ад народа, а не выконваўся прафесійнымі артыстамі, перадаваўся

ад пакалення да пакалення і цяперашнім мясцовым жыхарам быў даспадобы…».

У выніку праведзенай працы быў сабраны матэрыял, які даў магчымасць прасачыць гісторыю «Калядных цароў» у в. Семежава з моманту ўзнікнення абраду і да нашых дзён.

Адкуль жа і калі ў Семежаве з'явіўся гэты абрад? Мясцовы жыхар М. А. Скамарох апавядае наступную гісторыю: «У XVIII ст. у в. Семежава знаходзіўся атрад рускай царскай арміі. Салдаты і афіцэры ў час Калядаў хадзілі ў сваёй вайсковай форме па вясковых хатах, віншавалі гаспадароў са святам, паказвалі невялікае прадстаўленне, танцавалі, спявалі, пасля прасілі дары. Затым, калі атрад пакінуў вёску, мясцовыя жыхары, у асноўным маладыя хлопцы, пачалі для калядных абыходаў апранацца ў карнавальныя касцюмы, што нагадвалі вайсковую форму, і гэтыя персанажы былі празваны ў народзе «царамі». Да цароў далучаліся даўнія мясцовыя персанажы Дзед і Баба, якія, акрамя таго, сустракаліся тут і ў час традыцыйнага вяселля».

Навукоўцы не абвяргаюць, але і не пацвярджаюць такую версію. Вядома, што інтэрмедыя семежаўскіх «цароў» нагадвае сцэны народнай драмы «Цар Максімілян», якая ў далёкім мінулым шырока бытавала ў Беларусі, Украіне, Расіі. Паказы яе ў Беларусі зафіксаваны з сярэдзіны XIX ст. У энцыклапедыі «Беларускі фальклор» адзначаецца, што выконвалася драма «Цар Максімілян» на Каляды, гэта і абумовіла яе асаблівасці, перш за ўсё вольнае, свайго роду карнавальнае светаадчуванне, народна-святочную сістэму вобразаў. Менавіта гэта прадстаўленне было пакладзена ў аснову сюжэта семежаўскіх «Калядных цароў». Так з году ў год маршыравалі «цары» па Семежаве: на змену адным пакаленням прыходзілі новыя.

Перарываецца гэтая сувязь пакаленняў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Савецкая ўлада ўводзіла новыя святы і, жорстка адвяргаючы рэлігію, стала на шлях забароны народных свят мінулага. Калі праваслаўнаму і каталіцкаму хрысціянству спатрэбіліся стагоддзі, каб ахрысціць насельніцтва і забараніць язычніцкія святы, то савецкай уладзе спатрэбілася ўсяго некалькі дзесяцігоддзяў, каб не толькі забараніць язычніцкія і каляндарныя святы, але і амаль выкрасліць з народнай памяці духоўную спадчыну мінуўшчыны.

Але народная памяць здольная ў любых умовах захаваць тое, што дорага і неабходна чалавеку дзеля яго гарманічнага і нармальнага побыту. Нягледзячы на забарону, жыхары Семежава спраўлялі вякамі шануемыя святы. Ніколі не забывалі і пра «Калядных цароў».

Але рэформы ў палітыцы, эканоміцы, ідэалогіі часоў так званай перабудовы, якая пачалася ў Савецкім Саюзе ў сярэдзіне 1980-х гг., прынеслі перамены і ў Семежава. У 1997 г. на Стары Новы год тут адбыўся сапраўдны цуд: да семежаўцаў у госці зноў прыйшлі калядныя «цары».

Менавіта з 13 студзеня (у вернікаў Шчадрэц) 1997 г., цяпер ужо ні ад каго не хаваючыся і нікога не баючыся, па Семежаве зноў пайшлі калядныя цары. Абрад пасля доўгага перапынку пачаў сваё новае жыццё. Вялікая заслуга ў яго адраджэнні належыць работнікам Семежаўскага цэнтра культуры і адпачынку, раённага цэнтра культуры сумесна з аддзелам культуры Капыльскага райвыканкама, якія многа зрабілі для таго, каб гэты цуд адбыўся. Але без удзелу ўсіх жыхароў Семежава адраджэнне абраду было б немагчыма. Вось што ўспамінаў Георгій Ціманаў, старэйшы ўдзельнік абраду, які выконваў ролю Мамая: «Аднаўляць свята было складана. Мы знайшлі фотаздымак «цароў» 1950-х гг., дзякуючы якому даведаліся пра знешні выгляд персанажаў абраду. Касцюмы шылі самі. Калі мы выйшлі калядаваць першы раз, людзям вельмі спадабалася».

У гурт калядных «цароў» уваходзяць сем маладых хлопцаў, якія апрануты ў белыя кашулі, белыя штаны, падпярэзаны чырвонымі семежаўскімі паясамі з геаметрычным арнаментам, грудзі таксама перавязваюцца крыж-накрыж паясамі, на шыю павязваецца жаночая вялікая хустка «тарыноўка» ў буйную клетку або ў кветкі, якая закладваецца за паясы. На нагах – чорныя боты, на галаве – высокія папяровыя шапкі з рознакаляровымі кутасамі. Ва ўсіх «цароў» з левага боку прымацавана шабля. Кожны з «цароў» меў пэўнае імя – цар Максімілян, цар Мамай і г. д. – і паводзіў сябе ў адпаведнасці з гэтым вобразам. Акрамя цароў, у калядным гурце знаходзіцца «лекар» (апрануты ў цёмную ваенную форму, боты, на галаве – фуражка, праз плячо – медыцынская сумка, у руках – градуснік з кардону), музыка і барабаншчык. Хлопцы, якія выконваюць ролі цароў, імкнуцца апрануцца як мага прыгажэй, з форсам. Акрамя іх, у склад гурта ўваходзяць Дзед і Баба. Ролю Дзеда звычайна выконвае дзяўчына, апранутая ў бруднае, рванае мужчынскае адзенне, твар пэцкае сажай. Ролю Бабы выконвае вяртлявы хлопец, апрануты адпаведна. Гэтыя персанажы смяшаць гледачоў, робяць усялякую шкоду, абдымаюцца і цалуюцца паміж сабой і з прысутнымі, «крадуць» рэчы ў гаспадароў.

«Цары» збіраюцца і апранаюцца ўсе разам у якой-небудзь адной хаце. Ходзяць у тыя хаты, дзе жывуць незамужнія дзяўчаты, або туды, куды запрашаюць загадзя. Выходзячы на вуліцу, выстройваюцца па росце. Паперадзе ідзе «цар» – самы прыгожы і вясёлы хлопец, заключнымі ідуць барабаншчык з музыкай і механоша («механоша» з мяшком і санкамі, на якіх стаіць крэсла ў выглядзе трона – сімвала ўлады цароў). Лекар – галоўны камандзір, ідзе збоку. Калі кажа «налева» – дык ідуць у хату, якая знаходзіцца з левага боку, «направа» – заходзяць у хату з правага боку. Маршыруюць пад гукі барабана, па баках бягуць Дзед і Баба, у руках у Дзеда пуга. Калі пачынала цямнець, удзельнікі гурта запальвалі паходні. Зайшоўшы ў хату, разыгрывалі сцэнкі з бойкай «цароў», лячэннем пабітага «цара» і г. д. Баба і Дзед вырабляюць, што надумаюць, каб уважыць святочны настрой прысутных.

Такім чынам, з 1997 г. шчадравальнае прадстаўленне «Калядныя цары» больш ніколі не перарывалася, набываючы ўсё большую папулярнасць сярод мясцовага насельніцтва, удасканальваліся змест абраду, касцюмы, дыялогі. Слава аб абрадзе хутка разляцелася далёка за межы Семежава.

Перад пачаткам шчадравальнага абыходу каляднымі «царамі» ў Семежаве ладзяцца гандлёвыя кропкі, гульнявыя атракцыёны, спартыўныя гульні, калядная варажба, калядны кірмаш, праводзіцца дэгустацыя традыцыйных семежаўскіх страў, канцэрт мастацкай самадзейнасці, адбываюцца тэатралізаваныя прадстаўленні з каляднымі персанажамі і г. д.

На час правядзення каляднага абраду «Цары Каляды» ў вёску Семежава прыязджае даволі вялікая колькасць турыстаў, гасцей. Многія з іх спецыяльна рыхтуюцца і далучаюцца да ўдзелу ў свяце. Рэалізуюцца турыстычныя маршруты. Яны спалучаюць у сабе наведванне музея імя М. Высоцкага, раённага цэнтра ткацтва, дзе можна пазнаёміцца з ткацтвам капыльскіх майстроў, а менавіта з тэхнікай выканання чырвона-белых семежаўскіх ручнікоў, якія ўнесены ў спіс нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь. Для турыстаў і гасцей праводзяцца майстар-класы, што з’яўляецца найбагацейшай пазнавальнай крыніцай, а таксама сродкам папулярызацыі.

Стасункі турыстаў з удзельнікамі свята падкрэсліваюць значнасць падзеі і для саміх «цароў», дапамагаюць усвядоміць каштоўнасць спадчыны продкаў. Людзі ганарацца тым, што бралі ўдзел у абрадзе «Цары».

Для далейшага захавання і пераемнасці абраду «Калядныя цары» вялікая работа праводзіцца работнікамі ўстаноў культуры. У першую чаргу Семежаўскім цэнтрам культуры і адпачынку, пры якім знаходзіцца гурт удзельнікаў (маладыя хлопцы) абраду. Дзякуючы плённай працы абрад існуе ў сваім першапачатковым выглядзе і перадаецца маладому пакаленню, не страчваючы сваіх традыцый.

Маладыя хлопцы (12 чалавек) збіраюцца ў гурты і ходзяць шчадраваць па вёсцы, дзе паказваць невялікае прадстаўленне – урывак з драмы «Цар Максімілян». Так адбываецца з году ў год. Ходзяць два гурты, каб як мага болей ахапіць вуліц і тым самым павіншаваць са святам амаль усіх жыхароў вёскі. Адзін гурт дарослых нежанатых хлопцаў, у асноўным яны працуюць у мясцовай гаспадарцы ААТ «Семежава» механізатарамі, слесарамі, жывёлаводамі. Другі гурт – вучні мясцовай Семежаўскай сярэдняй школы імя М. С. Высоцкага.

Жыхары з вялікай павагай адносяцца да прыходу «цароў». Звычайна семежаўцы сустракаюць «цароў» у так званай «халоднай» палавіне – пакоі, які не абаграецца. Да Каляд у хаце стараліся хораша прыбрацца: вымывалі, выскрэбвалі і сцены, і падлогі. І абавязкова ўпрыгожвалі: на абразы вешалі самыя лепшыя вышытыя або тканыя ручнікі, куфры,

ложкі засцілаліся самымі лепшымі тканымі посцілкамі, на падлогу клаліся тканыя ходнікі – палавікі. Так рыхтуюцца да Каляд і зараз. Гаспадары з задавальненнем прымалі віншаванні «цароў», адорвалі іх прысмакамі і прасілі, каб у наступны год таксама завіталі да іх. Лічылася, што «цары» неслі надзею на шчасце і дабрабыт у новым годзе, таму ўсюды яны былі жаданымі і ўсюды іх ад душы частавалі пірагамі і каўбасамі. Вось як аб гэтым успамінала 69-гадовая жыхарка Семежава Ніна Паўлаўна Курпан (арфаграфія арыгінала): «Мы любім “цароў” і ажыдаем іх усягда. Гэта ж раз у гаду. Я буду сустракаць іх піражком з сялькаю. Пакладу ў мех гарбузікі, канфеты, пячэнне, 10 рублёў і кусок сала. Нічога не шкадую. Мы лічым, што, як прыдуць калядоўшчыкі і мы іх адорым, – гэта як быццам прыбыль у хазяйстве». Закончыўшы прадстаўленне ў адной хаце і атрымаўшы пачастункі, «цары» ў суправаджэнні гасцей і мясцовых жыхароў наведвалі хату за хатай, дэманструючы даўні прыгожы абрад.

Калі Шчодры вечар набіраў сілу і пачынала змяркацца, «цары» бралі ў рукі паходні, і гэта надавала ўсяму дзейству незвычайную відовішчнасць і нават міфічнасць.

Вядзецца плённая работа па прапагандзе абраду «Цары Каляды» сярод мясцовага насельніцтва, школьнікаў. Паколькі ўдзельнікамі абраду з’яўляецца моладзь, то менавіта з імі праводзіцца шмат мерапрыемстваў для далейшага захавання і папулярызацыі элемента.

Дзеці і моладзь – самая дынамічная частка любога грамадства. Развіццё народных традыцый, лёс матэрыяльнай, духоўнай спадчыны ў многім залежыць ад маладога пакалення, таму работнікі Семежаўскага цэнтра культуры і адпачынку, настаўнікі Семежаўскай школы надаюць вялікую ўвагу далучэнню дзяцей да пераемнасці, захавання. Пры цэнтры працуе гурток па падрыхтоўцы да абрадавага абыходу двароў на Каляды. У ім займаюцца 12 маладых хлопцаў. Яны вывучаюць абрады і звычаі вёскі, песні, гульні, для іх ладзяцца майстар-класы па вырабе атрыбутыкі для абраду.

Пры Семежаўскай сярэдняй школе праводзяцца факультатыўныя заняткі «Семежавазнаўства», на якіх вывучаюцца абрады, святы, архітэктурныя асаблівасці будовы дамоў, традыцыйная кухня Семежава.

Дзеля таго, каб дзеці і моладзь перанялі мастацкія традыцыі сваёй мясцовасці, неабходна далучаць іх да работы па вывучэнні і захаванні народнай спадчыны. Школьнікі пачатковых класаў разумеюць значнасць мясцовага абраду, бо бачаць яго ў выкананні дарослых і моладзі. З ранніх гадоў яны рыхтуюцца стаць удзельнікамі каляднага свята, вывучаюць сцэнарый, падбіраюць сабе ролю і рыхтуюцца да яе.

Да вывучэння сваёй спадчыны актыўна далучаюцца настаўнікі. Вандроўкі падчас школьных канікул паказалі, што песенная, танцавальная, абрадавая спадчына – жывая з’ява. Матэрыялы экспедыцый становяцца дапаможнікамі ў працэсе навучання і далучэння дзяцей і падлеткаў да здабыткаў народнай творчасці.

Вучні рыхтуюць рэфераты, паведамленні, даклады аб народных святах, абрадах, звычаях, носьбітах, аб сваіх радаводах, якія грунтуюцца на ўспамінах бабуль і дзядуль.

З мэтай папулярызацыі абраду арганізуюцца мерапрыемствы для рознай узроставай аўдыторыі. Да прыкладу:

– сустрэча з былымі ўдзельнікамі абрадавага калектыву «Калядныя цары» Д. Козел і А. Шчэрба «Быць царом – гэта пачэсна»;

– майстар-клас «Святочныя стравы в. Семежава» (у рамках клуба народнай кухні «Семяжовачка») з прыцягненнем народных майстроў В. В. Мікалаевіч і В. М. Кіені;

– майстар-клас па вырабе атрыбутаў для абрадавага калектыву «Цары Каляды» сумесна з былым удзельнікам гурта А. М. Шчэрбай і пад яго кіраўніцтвам для вучняў школ раёна;

– гутаркі для вяскоўцаў і гасцеў вёскі «Святы і абрады нашай вёскі»;

– дэманстрацыя фотавыставы «Калядныя цары» ў Семежаўскай сярэдняй школе, у мясцовай бібліятэцы, на свяце в. Семежава «Зямля бацькоў…»;

– для малодшых школьнікаў у Семежаўскім цэнтры культуры і адпачынку дэманстрацыя і абмеркаванне фільма «Калядныя цары» і многія іншыя;

– выставы-дэгустацыі традыцыйных страў («саладуха», «юха», бурачны квас) «Пакаштуйце, вельмі смачна»;

– удзел у абласной выставе па нематэрыяльнай культурнай спадчыне, якая адбылася ў мастацкай галерэі Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці.

Агульнадаступная інфармацыя пра культурную спадчыну публікуецца на сайце Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці (https://www.cultur.by), на сайце «Жывая спадчына Беларусі» (https://living-heritage.by), сайце раённага аддзела культуры, на старонках у сацыяльных сетках. Носьбіты таксама ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы публікацый у сродках масавай інфармацыі.

У 2020 г. быў зняты фільм на БТ-3, паказаны ў перадачы «Жывая культура». Інклюзіўнасць, мясцовыя дыялекты надалі арганічнасці, жыццёвасці кінавобразу. Штогод з’яўляюцца новыя тэлерэпартажы і артыкулы ў розных СМІ.

«Калядныя цары» вядомы не толькі ў раёне, але і за яго межамі. Работнікі культуры для павышэння патэнцыялу аховы культурнай спадчыны арганізуюць супрацоўніцтва з іншымі арганізацыямі. Напрыклад, удзел у выставе «Нематэрыяльная культурная спадчына Міншчыны» ў абласным метадычным цэнтры народнай творчасці (г. Мінск, 2018 г.). Калектыў абраду змаглі ўбачыць госці, якія пабывалі на Капыльшчыне падчас правядзення свята беларускага пісьменства ў 2021 г. А сёлета з абрадам «Калядныя цары» пазнаёміліся на свяце «Александрыя збірае сяброў» на Магілёўшчыне падчас правядзення свята Купалле ў

аг. Александрыя, дзе была прадстаўлена нематэрыяльная спадчына з усіх рэгіёнаў краіны.

Для далейшага захавання элемента плануецца:

1. Стварыць пры цэнтры культуры і адпачынку пакой абрадавага калектыву «Цары», у якім будзе адлюстравана экспазіцыя па калядным абрадзе. Гэта ж натуральнае сведчанне жывой этнічнай культуры, якой ганарацца не толькі жыхары вёскі, але і госці Семежава.

2. Адкрыць аграсядзібу ў Семежаве для далейшага прытоку турыстаў, для папулярызацыі абраду, мясцовай кухні, традыцый ткацтва.

3. Выкарыстоўваць больш інфармацыі, медыяматэрыялаў пра традыцыйныя веды і практыкі ў дзейнасці экскурсаводаў для турыстаў.

4. Актыўна выкарыстоўваць базу даных сайта «Жывая спадчына Беларусі» (http://living-heritage.by), які вядзе Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, парады экспертаў у галіне народнай творчасці, інфармацыю ў СМІ пра элемент культурнай спадчыны, які захоўваецца ў раёне.

Адраджэнне шчадравальнага абраду «Калядныя цары» ў Семежаве паказвае, што час, якім бы працяглым і цяжкім ён ні быў, не можа пахаваць усё, таксама не памірае і чалавечая памяць. І ў гэтым феномен народнай душы, якая праз усе нягоды можа вяртацца да сваіх каранёў, захоўваючы спадчыну свайго народа для нашчадкаў. Сведчанне гэтаму – абрад, які захаваўся ў Семежаве.

Сёння «Калядныя цары» ўсведамляюцца семежаўцамі на ўзроўні лакальнай ідэнтыфікацыі як яркая, уласцівая толькі іх мясцовасці адметнасць каляндарна-абрадавай культуры.

Пасля таго, як «Калядныя цары» былі ўнесены ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА, цікавасць да абраду і да Семежава значна ўзрасла. Гэта гаворыць пра тое, што прэстыжны статус працуе на падтрымку і далейшую жыццядзейнасць абраду.

За вялікую работу па вывучэнні, адраджэнні і захаванні народных традыцый абрадавы калектыў «Цары» Семежаўскага цэнтра культуры і адпачынку па выніках 2010 г. стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, уручэнне якой адбылося ў Палацы Рэспублікі 8 студзеня 2011 г.

Аб сувязі і пераемнасці пакаленняў сведчыць гісторыя гэтага абраду. «Калядныя цары» – не проста прыгожае прадстаўленне, перанятае ў продкаў. Гэта – своеасаблівая звязваючая нітка паміж пакаленнямі. І тое, што сёння з’явіўся другі, больш малады склад калядоўшчыкаў з ліку семежаўскіх школьнікаў, дае надзею на доўгае жыццё гэтай семежаўскай традыцыі.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. *Антановіч, К.* Цары ў спісе спадчыны / К. Антановіч // Беларусь сегодня. – 2009. – 6 окт.

2. *Гурло, Г. А.* Цары пад аховай дзяржавы / Г. А. Гурло // Слава працы. – 2008. – № 8.

3. *Кухаронак, Т. І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 237 с.

4. *Саковіч, М.* «Цары» – лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта / М. Саковіч // Слава працы. – 2011. – 8 студз.



УДК 008:004+341.241.7(470+571)(410)(540)



**А. А. Гуцалов,**
*кандидат философских наук, ведущий научный сотрудник – руководитель отдела комплексных проблем изучения культуры Южного филиала ФГБНИУ «Российский научно-исследовательский институт культурного и природного наследия им. Д. С. Лихачева», г. Краснодар, Российская Федерация*


## СПЕЦИФИКА ЦИФРОВОГО НАСЛЕДИЯ В МЕЖДУНАРОДНОМ КОНТЕКСТЕ[1]


**Аннотация**. *Статья основана на результатах исследования по цифровому наследию в ряде стран, включая Россию, которое было проведено в Южном филиале Российского института культурного и природного наследия им. Д. С. Лихачева в рамках государственного задания в 2019–2020 гг. По его итогам в середине 2021 г. вышла коллективная монография [1]. В дополнение к результатам данного исследования автор статьи более объемно выявляет специфику цифрового наследия как части нематериального наследия, а также предлагает типологию стратегий в области цифровой политики на основе опыта таких стран, как Великобритания, Россия и Индия, сочетая теоретические выкладки с анализом статистических данных и результатов международных авторитетных индексов и рейтингов.*



**Ключевые слова:** *цифровизация, цифровая экономика, виртуальный, электронный, нематериальное наследие, цифровое наследие,*



[1] Статья написана в рамках государственного задания Южного филиала ФГБНИУ «Российский научно-исследовательский институт культурного и природного наследия имени Д.С. Лихачева» по теме «Цифровое наследие России: статус, состав, формы и способы государственной охраны: правовой анализ», номер государственной регистрации: АААА-А19-119050790072-5.